тивам удалось создать постановки, которые, используя одновременно и традиционные, и новейшие европейские театральные течения, несут зрителям аромат Востока.

Названные коллективы независимы и издают собственные манифесты, в которых излагают цели своей работы. В частности, в манифесте «Театра торжеств» говорится: «Эксперименты в театре происходят во все времена. Они законны, когда на деле обращены к людям, когда с точки зрения культуры, языка, традиции и морали правильно трактуют исторический процесс».

Хотелось бы, чтобы изложенные нами сведения о развитии и состоянии театрального дела в арабских странах были учтены при изучении студентами курса мировой культуры.

**Кузьмініч М.Л.**, *дацэнт*

## РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА ЯК ФОРМА АЦЭНКІ ЯКАСЦІ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТА

Педагагічны кантроль з'яўляецца важным элементам дзейнасці выкладчыкаў ВНУ. У працэсе кантролю адбываецца праверка вынікаў вучэбна-выхаваўчага працэсу, вызначаецца ўзровень засваення студэнтамі ведаў, уменняў і навыкаў. Ён скіраваны на стымуляванне іх вучэбнай дзейнасці і здзяйсняецца ў розных формах (экзамены, залікі, рубежны кантроль, акадэмічныя канцэрты, конкурсы і інш.).

Педагагічны кантроль адлюстроўваецца ў ацэнках і адзнаках (лічбавых аналагах ацэнак). У розных краінах свету ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці асобных педагогаў выкарыстоўваюцца разнастайныя сістэмы ацэньвання якасці падрыхтоўкі спецыялістаў — ад адмовы ад выстаўлення адзнак да выкарыстання шматбальных сістэм, тэстаў і г.д. Вядома «сістэма класіфікацыі» Фрэне (кожнаму вучню ў класе ў залежнасці ад яго паспяховасці выстаўляецца парадкавы нумар), 6-бальная (ад 0 да 6) сістэма ў царскай Расіі, навучанне без ацэнак (пастанова 1918 г. «Об отмене оценок» у Расіі), а таксама 2-, 10-, 12-, 20- бальная і іншыя сістэмы. Апошнім часам робяцца спробы ўдасканаліць атрымаўшую шырокае распаўсюджанне 4-бальную сістэму (ад 2 да 5) пры дапамозе «+» і «-» — ператварыць яе ў 10-бальную: 2, 3-, 3, 3+, 4-, 4, 4+, 5-, 5, 5+. У Беларускім універсітэце культуры на ўступных экзаменах прайшла апрабацыю 6-бальная сістэма: 2, 3, 3+, 4, 4+, 5.

Усё гэта дазваляе дабіцца большай дыферэнцыяцыі ў ацэнцы ведаў студэнтаў, павышае выхаваўчыя магчымасці педагагічнага кантролю.

Любое ацэньванне павінна абапірацца на прынцыпы аб'ектыўнасці, сістэматычнасці і галоснасці. Рэалізаваць іх у поўным аб'ёме часам бывае вельмі цяжка. Таму ў ходзе рэфармавання вышэйшай школы паступаюць прапановы аб стварэнні незалежных экзаменацыйных камісій, аб удасканаленні сістэм ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў (у прыватнасці, аб укараненні рэйтынгавай сістэмы).

У музычным навучанні дасягненні студэнта вымяраюцца, як правіла, у канцы семестра ў час здачы залікаў ці экзаменаў па 4-бальнай сістэме. Выніковая ацэнка часцей за ўсё сведчыць аб узроўні выканальніцкага майстэрства дадзенага студэнта. Але пры гэтым не ўлічваецца выхаваўчая функцыя ацэнкі: па-за ўвагай застаюцца наведванне заняткаў, падрыхтоўка да іх, вынікі тэхнічнага заліку, акадэмканцэрта і іншых форм рубежнага кантролю, дынаміка росту майстэрства студэнта і інш. Можа атрымацца, што пры аднолькавым выніку на экзамене студэнты

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

на працягу семестра дэманстравалі розныя адносіны да навучальнага працэсу. Студэнт адораны, напрыклад, мог бы паказаць значна лепшыя вынікі, але не працаваў на поўную моц і за кошт свайго прыроднага таленту змог выканаць семестравыя патрабаванні. Другі студэнт, з сярэднімі здольнасцямі, дасягнуў такіх самых вынікаў, але за кошт напружанай і настойлівай працы на працягу семестра.

Сапраўды, у музычным мастацтве слухача не цікавіць, якімі намаганнямі дасягнуты пэўны вынік. І на дзяржаўных экзаменах у навучальных установах менавіта з такіх пазіцый трэба падыходзіць да выстаўлення ацэнак. Але ў ходзе вучэбна-выхаваўчага працэсу трэба максімальна выкарыстоўваць усе магчымасці ацэньвання паспяховасці, заахвочваць студэнта, забяспечваць неабходную матывацыю.

Вырашыць гэтую задачу дапамагае, у прыватнасці, рэйтынгавая сістэма ацэнкі паспяховасці ў засваенні вучэбных курсаў. Асабліва добра гэтую сістэму можна выкарыстоўваць пры адсутнасці ў канцы некаторых семестраў форм кантролю — заліку ці экзамену. Сістэма шырока выкарыстоўваецца ў ВНУ Захаду. У дачыненні да лекцыйнага курса « Музычная педагогіка» ў Беларускім універсітэце культуры рэйтынгавая сістэма ацэнкі можа выглядаць наступным чынам.

Курс лічыцца засвоеным (выстаўляецца «залік»), калі студэнт набраў не менш 120 балаў пры максімуме 200 балаў. Пры гэтым

а) наведванне кожнай лекцыі (наведванне лічыцца пажаданым, але не абавязковым) ацэньваецца у 5 балаў:

12 лекцый * 5 балаў = 60 балаў (максімум);

б) наведванне кожнага семінара (абавязкова) ў 5 балаў:

5 семінараў * 5 балаў = 25 балаў ;

в) ступень падрыхтаванасці да кожнага семінара ў 5 балаў:

5 семінараў * 10 балаў = 50 балаў (максімум);

г) паспяховая здача ў канцы семестра (адказ на пытанні курса) — 65 балаў

Усяго 200 балаў (максімум).

Заўвага: прапушчаныя семінары студэнты павінны адпрацаваць.

У дачыненні да практычнага курса «Спецінструмент» у нашым універсітэце рэйтынгавая сістэма ацэнкі можа выглядаць наступным чынам.

Студэнт атрымлівае залік (ці становучую адзнаку), калі набраў за семестр не менш за 41 бал для экзамену пры максімальнай колькасці балаў 100.

Пры гэтым «залік» па колькасці набраных балаў адпавядае ацэнцы «4» на экзамене:

| Адзнакі | Колькасць балаў | Залік / незалік |
|---|---|---|
| 5 | 81-100 | залік |
| 4 | 61-80 | залік |
| 3 | 41-60 | незалік |
| 2 | 0-40 | незалік |

Балы налічваюцца за наступнае :

а) наведванне заняткаў і падрыхтоўка да іх перад першай рубежнай праверкай — 15 балаў;

б) вынікі рубежнай праверкі (тэхнічны залік,акадэмічны канцэрт) — 30 балаў;

в) наведванне заняткаў і падрыхтоўка да іх перад выніковай семестравай праверкай — 15 балаў;

г) вынікі заліку (ці экзамену) па спецінструменту — 40 балаў.

Усяго 100 балаў.

Заўвага: колькасць балаў для здачы заліку выкладчык можа паменшыць, але яна павінна быць не ніжэй за 41 бал.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівай размовы заслугоўвае тэхніка выстаўлення адзнак на экзаменах, заліках і акадэмічных канцэртах па музычных дысцыплінах. Па-першае, мастацтва само па сабе цяжка паддаецца ацэнцы, па-другое, яго ўспрыманне вельмі суб'ектыўнае. Патрабуецца распрацоўка дакладнай сістэмы крытэрыяў, вызначэнне іх значнасці ў адносінах адзін да другога. Карысным уяўляецца прымяненне сістэмы ацэнкі выступлення студэнтаў, якая дала б магчымасць вызначыць рэйтынг кожнага з іх у межах вучэбнай групы выканаўцаў на адным з інструментаў ці нават усёй спецыялізацыі.

Выкарыстанне вышэйапісанай сістэмы выклікае пэўную цяжкасць у сувязі з неабходнасцю яе карэляцыі з 4-бальнай сістэмай ацэнкі. Таму пры выстаўленні адзнакі на тэхнічным заліку (акадэмічным канцэрце) і экзамене можна карыстацца наступнай табліцай.

| Балы на тэхнічным заліку | Адзнака | Балы на выніковым экзамене |
|---|---|---|
| 25-30 | 5 | 33-40 |
| 19-24 | 4 | 25-32 |
| 13-18 | 3 | 17-24 |
| 0-12 | 2 | 0-16 |

На экзамене па інструментальнаму ансамблю намі былі выкарастаны наступныя крытэрыі ацэнкі студэнтаў: кожны студэнт павінен падрыхтаваць праграму з трох-чатырох рознахарактарных твораў,у тым ліку адзін твор выконваецца сола ў суправаджэнні ансамбля. У праграму можна ўключыць акампанемент вакалісту, хору ці танцавальнаму калектыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ацэначны ліст (запаўняецца на кожнага студэнта)

| Крытэрыі ацэнкі | Узроўні майстэрства, ці якасці работы па кожным крытэрыі | | | |
|---|---|---|---|---|
| | выдатны 20-25 балаў | добры 14-19 балаў | насрэдны 8-13 балаў | недапушчальны да 8 балаў |
| 1.Узровень складанасці праграмы (твора)<br>2.Майстэрства ўвасаблення ідэйна-мастацкага вобраза твора (выканальніцкае майстэрства калектыву)<br>3.Выканальніцкае майстэрства кожнага ўдзельніка ансамбля<br>4.Якасць інструментоўкі | | | | |
| Усяго балаў: | | | | |

На экзамене па дырыжыраванню з аркестрам прапануецца выкарыстаць наступныя крытэрыі ацэнкі: кожны студэнт павінен падрыхтаваць праграму з двух-трох рознахарактарных твораў. У праграму можна ўключыць акампанемент хору ці вакалісту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ацэначны ліст

| Крытэрыі ацэнкі | Узроўні майстэрства, ці якасці работы па кожным крытэрыі | | | |
|---|---|---|---|---|
| | выдатны 20-25 балаў | добры 14-19 балаў | пасрэдны 8-13 балаў | недапушчальны да 8 балаў |
| 1. Узровень складанасці праграмы<br>2.Майстэрства ўвасаблення ідэйна-мастацкага вобраза твора<br>3.Валоданне тэхнікай дырыжыравання, усімі сродкамі кіравання аркестрам<br>4.Ступень эмацыянальна-валявога ўздзеяння на аркестрантаў | | | | |
| Усяго балаў: | | | | |

І па інструментальнаму ансамблю, і па дырыжыраванню выкарыстоўваюцца аднолькавыя працэдуры ацэньвання з пераводам атрыманых балаў у 4-бальную сістэму: кожнаму студэнту па кожным крытэрыі выстаўляюцца балы ад 0 да 25. Максімальна магчымая колькасць балаў па чатырох крытэрыях — 100. Адзнака выстаўляецца ў адпаведнасці з колькасцю рэальна набраных балаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Экзаменацыйная ацэнка | Набраныя балы | Залік/незалік |
|---|---|---|
| 5 | 81 - 100 | залік |
| 4 | 61 - 80 | залік |
| 3 | 41 - 60 | незалік |
| 2 | 21 - 40 | незалік |
| 1 | 0 - 20 | незалік |

Апрабацыя выкладзеных вышэй падыходаў патрабуе ад выкладчыкаў і студэнтаў пэўнай падрыхтаванасці. У той жа час атрыманы вопыт паказвае, што прапанаваная сістэма педагагічнага кантролю і ацэнкі студэнтаў дае магчымасць больш поўна рэалізаваць прынцыпы аб'ектыўнасці, сістэматычнасці і галоснасці.

Выстаўленне балаў на заліках, экзаменах, акадэмічных канцэртах можа весціся ў адпаведнасці з прынятымі на конкурсах правіламі (25-бальная сістэма).

| Балы | Адпаведныя адзнакі па 5-бальнай сістэме |
|---|---|
| 1 | 1— |
| 2 | 1- |
| 3 | 1 |
| 4 | 1+ |
| 5 | 1++ |
| 6 | 2— |
| 7 | 2- |
| 8 | 2 |
| 9 | 2+ |
| 10 | 2++ |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Балы | Адпаведныя адзнакі па 5-бальнай сістэме |
|---|---|
| 11 | 3— |
| 12 | 3- |
| 13 | 3 |
| 14 | 3+ |
| 15 | 3++ |
| 16 | 4— |
| 17 | 4- |
| 18 | 4 |
| 19 | 4+ |
| 20 | 4++ |
| 21 | 5— |
| 22 | 5- |
| 23 | 5 |
| 24 | 5+ |
| 25 | 5++ |

Пры выкарыстанні 25-бальнай сістэмы трэба ўнесці карэктывы ў суадносіны колькасці балаў, якія налічваюцца па розных крытэрыях. Пры гэтым колькасць балаў за выніковы залік-экзамен (25 балаў) не павінна перавышаць 50 % максімальнай колькасці, напрыклад: наведванне — 10 балаў; рубежны кантроль — 25; выніковы кантроль — 25. Усяго 70 балаў.

Выкарыстанне бальнай конкурснай сістэмы на экзаменах і заліках па спецінструменту дазваляе больш аб'ектыўна ацаніць выступленні студэнтаў, улічыць асобныя нюансы, вызначыць рэйтынг кожнага студэнта ў групе, што немалаважна ў выхаванні адпаведных прафесійных якасцей будучых музыкантаў, стварэнні неабходнай матывацыі і зааховачванні студэнтаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ